работы, яму прадстаўляецца такая магчымасць у выглядзе дадатковых задач або пытанняў. Гэта дазволіць не парушаць правілаў ацэньвання ў вышэйшай школе.

Такім чынам, бесперапынны кантроль работы студэнтаў-завочнікаў дазволіць развіць у іх самастойнасць у авалоданні ведамі, забяспечыць высокі ўзровень засваення матэрыялу, будзе служыць сродкам актывізацыі інтэлектуальнай дзейнасці. Выкарыстанне распрацаваных крытэрыяў і правілаў ацэньвання пісьмовых работ па матэматычных дысцыплінах у вышэйшай школе створыць умовы для адэкватнага адлюстравання ведаў, набытых у працэсе самастойнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў, дазволіць знізіць суб'ектыўнасць выкладчыка ў ходзе кантролю ведаў, павысіць дакладнасць выстаўляемай адзнакі, палепшыць кіраўнічыя функцыі традыцыйнага кантролю, дэмакратызаваць навучанне.

*ЛІТАРАТУРА*


1. *Васильев Ю. С., Глухов В. В., Федоров А. В.* Экономика и организация управления вузом: Учеб. / Под ред. д-ра эконом. наук В. В. Глухова. СПб., 1999.
2. *Пидкасистый П. И., Портнов М. Л.* Опрос как средство обучения. М., 1999.
3. Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь. Мн., 1995. № 7—8 (443).


*SUMMARY*


*In the article we are considering the problem of estimating test-papers in Mathematics done by the students of higher educational institutions. We show the dependence of the quality of the fulfilment of Mathematics test on the choice of the right strategy, the degree of the validity of the chosen method, the presence of mistakes in calculations. We prove the possibility and convenience of application of the suggested criteria in teacher's work and suggest the algorithm of the transition from the average mark for the work to a discrete mark.*


---

*УДК 373.2*

***Дз. М. Дубініна***

# ДАШКОЛЬНІК І МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА

Мастацкая літаратура займае пачэснае месца ў агульнай сістэме выхавання і навучання дашкольнікаў. У працэсе слухання літаратурных твораў у дашкольнікаў назіраецца асаблівая цікавасць да гучання мастацкага слова. Яны адчуваюць яго рытмічнасць, мілагучнасць, вобразнасць, заўважаюць і паўтараюць вобразныя выразы, удалыя і трапныя параўнанні. К. Чукоўскі, які з асаблівай увагай ставіўся да развіцця дзіцячага маўлення, сцвярджаў, што маленькія дзеці ўвогуле валодаюць асаблівым моўным чуццём. Гэта пацвярджаецца іх імкненнем да рытмічных словазлучэнняў, мілагучных вершаў, апавядальных казак, бадзёрага скандзіравання лічылак і заклічак. Той факт, што разам са зместам літаратурных твораў дашкольнікаў цікавяць некаторыя элементы іх мастацкай формы, дае магчымасць гаварыць, што радасць, якая праяўляецца дзецьмі пры слуханні мастацкіх твораў, сведчыць аб здольнасці дашкольнікаў да эстэтычнага ўспрымання мастацтва слова.

Знаёмства дзяцей з кнігай суправаджаецца глыбокім пранікненнем у духоўныя вытокі роднай мовы. Жадаючы зразумець твор, дзіця адначасова стараецца зразумець і словы, з якіх гэты твор складаецца, усвядоміць іх структуру. Менавіта мастацкая літаратура з'яўляецца вызначальнай асновай развіцця ў дзіцяці мілагучнага і трапнага роднага слова.

Роля і значэнне мастацкай літаратуры яшчэ больш павялічваюцца ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. Яна з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных сродкаў навучання першапачатковым навыкам разумення беларускай мовы, паступовага папаўнення і замацавання слоўнікавага запасу, а таксама ўзнаўлення пачутага на роднай мове.

Мастацка-маўленчыя заняткі, на якіх адбываецца знаёмства з мастацкай літаратурай, выступаюць для дашкольнікаў як узор правільнага беларускага маўлення. Эстэтычнае ўспрыманне мастацкага твора суправаджаецца знаёмствам дзяцей з пэўным суаднясеннем лексічных адзінак, асаблівасцямі дзеяслоўнага кіравання і г. д. Акрамя таго, на такіх занятках дзеці вучацца слухаць не толькі чытанне ці расказванне выхавальніка, але і паступова набываюць навыкі гаварэння, гэта значыць узнаўлення раней пачутага, у час якога адбываецца развіццё актыўнага слоўніка і засваенне разнастайных граматычных форм.

Але мастацкая літаратура выконвае сваё прызначэнне выхоўваць і ўсебакова развіваць дзяцей тады, калі пры ўспрыманні твора

праяўляюцца пачуцці, узнікаюць думкі, калі твор прыносіць эстэтычнае задавальненне. Разам з выхаваннем высокай мастацкасці і духоўнасці літаратурныя творы з'яўляюцца першакрыніцай навучання дашкольнікаў роднай мове. Яркія вобразы, трапныя словы і выразы мастацкай літаратуры закладваюць у дзецях асновы любві да роднай мовы, да роднай прыроды, да свайго народа, да Айчыны.

Успрыманне літаратурных твораў дазваляе дашкольнікам з усёй глыбінёй пранікнуць у іх мастацка-эстэтычны змест. На развіццё мастацкага ўспрымання дашкольнікаў значна ўплывае іх папярэдняе сенсорнае выхаванне. Так, слуханне мастацкага твора ўяўляе сабой складаны працэс перцэптыўнай дзейнасці, у ходзе якой дзіця ўспрымае твор пры дапамозе слыхавога аналізатара. Менавіта гэты аналізатар забяспечвае адчуванне дзецьмі інтанацыйнай выразнасці мастацкага зместу літаратурнага твора.

Не меншую ролю ў актывізацыі слухання выконвае ўключэнне зрокавага аналізатара, які абумоўлівае ўзнікненне пэўнай мімікі і жэстаў у час расказвання мастацкага твора выхавальнікам.

Разам з тым успрыманне мастацкай літаратуры непарыўна звязана з пранікненнем у мастацка-вобразны змест яе твораў. У літаратурных мастацкіх вобразах адлюстроўваецца ўсё рэальнае навакольнае жыццё. Зразумела, што іх успрыманне апасродкавана мінулым вопытам чалавека, які пачынаецца ад самага нараджэння і з цягам часу ўсё больш удасканальваецца. Чым цяснейшая сувязь існуе паміж зместам мастацкага твора і жыццёвым вопытам дашкольнікаў, тым большай эмацыянальнасцю вызначаецца іх успрыманне. Спасціжэнне мастацкіх літаратурных твораў суправаджаецца ўзнікненнем глыбокага эмацыянальнага водгуку — пачуцця захаплення, радасці, сумнення, смутку. На думку Л. С. Выгоцкага, эстэтычная рэакцыя на творы мастацтва ўвогуле ляжыць на стыку пачуцця і ўяўлення.

Аб магчымасці дашкольнікаў глыбока ўспрымаць змест літаратурных твораў як мастацтва слова, пранікаць у іх маральна-эстэтычны сэнс сведчаць псіхалагічныя даследаванні Д. Б. Эльконіна, А. У. Запарожца, Л. І. Бажовіч, Л. С. Славінай. Псіхолагі адзначаюць, што характэрныя асаблівасці псіхікі, усведамлення і паводзін дзяцей дашкольнага ўзросту дазваляюць выхавальніку актыўна кіраваць працэсам успрымання мастацкага твора, які з боку дашкольнікаў носіць актыўны і дзейсны характар.

Іншай думкі прытрымліваюцца на гэты конт некаторыя замежныя псіхолагі (Ж. Піажэ, І. Алпертон). Яны аспрэчваюць актыўнае і дзейснае ўспрыманне мастацкага твора дзецьмі і сцвяджаюць, што дашкольнікам уласцівы эгацэнтрызм, нежаданне і няўменне перайсці на пункт гледжання іншых. На іх думку, дашкольнікі не могуць зразумець мовы і ўчынкаў герояў літаратурных твораў.

Між тым даследчыкі Д. Б. Эльконін, А. У. Запарожац, Л. С. Славіна паказваюць, што ўспрыманне мастацкіх твораў дашкольнікамі суправаджаецца шчырасцю, праўдзівасцю, непасрэднасцю перажыванняў і зацікаўленасцю, захаплярнасцю, развіццём уяўленняў, на аснове якіх пераўтвараецца вопыт дзіцяці.

Акадэмік А. У. Запарожац адзначае, што актыўнае ўспрыманне мастацкага твора дашкольнікамі яскрава праяўляецца ў працэсе яго слухання. Калі твор зацікавіў дзяцей, то яны ўвесь час перапыняюць ход расказвання, уключаюцца самі ў падзеі, звяртаюцца да дарослага з пытаннямі, намагаюцца дапамагчы героям. «Дзіця не хоча і не ўмее займаць пазіцыю староннага гледача ўсіх апісваемых у казцы падзей. Яно намагаецца ўключыцца ў іх ход, перайсці на бок той ці іншай асобы, намагаецца рэалізаваць мэты пазітыўнага персанажа не толькі ў думцы, але і дзейсна!»[1] [1].

Дашкольны ўзрост з'яўляецца перыядам актыўнага станаўлення ўспрымання мастацкіх твораў дзецьмі. Так, успрыманне мастацкага твора малодшымі дашкольнікамі вызначаецца непасрэднасцю. Яны эмацыянальна ўспрымаюць падзеі, што адбываюцца ў творы, актыўна перажываюць усё, што адбываецца з героем, нават з фантастычным, суперажываюць разам з ім. Іх вельмі радуе спрыяльны ход падзей, перамога дабра над злом.

Пры гэтым увага маленькіх у большай ступені звернута на саміх герояў твора. Дашкольнікаў цікавіць іх знешні выгляд, дзеянні, учынкі. Адной з характэрных асаблівасцяў успрымання мастацкіх твораў малодшымі дашкольнікамі з'яўляецца імкненне да рытмічна-арганізаванага складу маўлення, гучных рыфмаў, дакладных рытмаў, выразнай інтанацыі. Менавіта ў гэтым узросце дзеці больш за ўсё любяць слухаць (і чытаць) вершаваныя творы.

Пасля чатырох гадоў мастацкі вопыт дзяцей удасканальваецца і ўзбагачаецца. Дашкольнікі пачынаюць адрозніваць межы паміж рэальнымі і казачнымі жанрамі, адчуваюць законы казачнай фантастыкі, што дазваляе паступова развіваць першыя ўяўленні дзяцей аб некаторых асаблівасцях жанру (загадкі, казкі, апавяданні, небыліцы).

---

[1] Пераклад цытаты на беларускую мову аўтара артыкула — ***Дз. Д.***

У сярэднім дашкольным узросце дзеці дастаткова асэнсавана ўспрымаюць мастацкі твор. Пры гэтым яны лёгка ўстанаўліваюць простыя прычынныя сувязі ў сюжэце, характарызуюць герояў кніг, часцей выказваюць правільныя меркаванні пра іх учынкі, якія грунтуюцца на пэўных жыццёвых уяўленнях аб нормах жыццёвых паводзін. Эмацыянальныя адносіны да герояў кніг і літаратурных фактаў набываюць у дзяцей дзейснае жыццёвае значэнне. Дашкольнікі саўдзельнічаюць разам з героямі пачутага твора. Яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі адлюстроўваемых падзей, якія імкнуцца пражыць у сваіх думках і перажыць іх разам з героямі твора.

Бывае, што актыўныя адносіны дзяцей да твораў мастацтва прыводзяць да нечаканых, з пункту гледжання дарослых, дзеянняў, што часта праяўляецца і вонкава. Рухомае спачуваннем да героя дзіця спрабуе непасрэдна, практычна ўздзейнічаць на творы мастацтва замест таго, каб перанесці свае адносіны на рэчаіснасць, якая ў іх адлюстравана. Чорнаю фарбаю замалёўвае на карцінцы адмоўнага героя, вырывае ілюстрацыю з яго адлюстраваннем, прапускае ў час пераказу непрыемныя падзеі, змяняе іх ход, канцоўку твора.

Неабходна адзначыць, што старэйшыя дашкольнікі могуць ужо ў пэўнай ступені перажыць ва ўяўленнях змест таго, пра што напісана ў кнізе. У гэтым узросце яны пераходзяць на стадыю ўласна мастацкіх адносін да літаратуры. А. У. Запарожац адзначае, што дзяцей ужо не задавальняе такое вызначэнне сітуацыі, калі невядома, хто добры, а хто дрэнны. Яны намагаюцца ў час успрымання адразу вызначыць станоўчых герояў, прыняць іх пазіцыю і негатыўна ставяцца да тых, хто іх у гэтым творы не задавальняе. Бывае, што нават нежывыя рэчы паддаюцца суровай крытыцы, калі дзіця не знаходзіць таго, каго можна было б абвінаваціць у тым, што здарылася.

Характэрнымі асаблівасцямі ўспрымання становяцца выбарачныя адносіны дашкольнікаў да твораў пэўнага зместу і стылю (казачных, вандроўніцкіх, прыродазнаўчых, гістарычных, фантастычных і інш.).

У працэсе ўспрымання мастацкага твора старэйшыя дашкольнікі спрабуюць устанаўліваць шматлікія сувязі ў тэксце (логіку падзей, прычыны і вынікі ўзнікнення канфліктаў, матывы паводзін герояў, ролю мастацкай дэталі і інш.).

У старэйшай групе дзеці ўспрымаюць літаратурнага героя ў яго розных праяўленнях. Іх цікавіць не толькі знешні выгляд героя, але і яго ўчынкі, перажыванні, думкі, якім маленькія слухачы імкнуцца даць пэўную ацэнку.

Такое актыўнае ўспрыманне мастацкіх твораў, уменне прыняць пазіцыю героя выступае своеасаблівым рэгулятарам паводзін старэйшых дашкольнікаў. Так, пасля чытання апавядання В. Асеевай «Чароўнае слова» дзеці адзін аднаму робяць заўвагу: «Ты забыў сказаць чароўнае слова».

Даследаванні Л. С. Славінай, Н. С. Карпінскай сведчаць пра тое, што дзецям старэйшага дашкольнага ўзросту даступна ўспрыманне мастацкага твора з маральным зместам, хоць яны і даюць у большай ступені яшчэ абагульненыя і аднатыповыя ацэнкі — «добра», «дрэнна». Часта маральная ацэнка супадае ў дзяцей з эмацыянальнымі адносінамі да героя («Ён добры, мне падабаецца, я яго люблю»).

Дзейнасць і актыўнасць ва ўспрыманні твора дзецьмі, іх уменне ацэньваць учынкі героя адзначае і Н. С. Карпінская. Яна падкрэслівае, што сваё стаўленне да герояў дзеці выяўляюць хутка і ў большасці выпадкаў правільна.

Неабходна адзначыць, што адносіны да прачытанага ў старэйшых дашкольнікаў знешне праяўляюцца не так ярка, як у маленькіх, але разам з тым яны набываюць значна большую асэнсаванасць, глыбіню і ўстойлівасць. Эмацыянальны водгук, які выклікаюць кнігі, узбагачае духоўны свет дзіцяці, рыхтуе яго да рэальнага жыцця, павышае цікавасць да ўнутранага свету людзей, дапамагае ім лепей убачыць драматычнае і камічнае ў жыцці, з гумарам адносіцца да некаторых жыццёвых сітуацый. Гэта, у сваю чаргу, вядзе да фарміравання ў старэйшых дашкольнікаў мастацкага густу. У іх з'яўляюцца любімыя апавяданні, казкі, пісьменнікі.

Выкарыстанне мастацкай літаратуры, яе пэўных твораў вызначаецца той праграмай выхавання і навучання, па якой працуе дзіцячы сад. Аднак кола дзіцячага чытання ўвесь час значна пашыраецца. Перад выхавальнікам узнікае пытанне: што чытаць дашкольнікам?

У першы пласт дзіцячага чытання ўключаюць усе жанры вуснай народнай творчасці, у тым ліку казку. Пры гэтым слушна адзначаецца, што карысна знаёміць дзяцей не толькі з творамі роднага вуснага мастацтва, але і з лепшымі фальклорнымі ўзорамі слоўнага мастацтва братніх народаў (рускіх, украінцаў, славакаў, сербаў і г. д.), а таксама народаў усяго свету.

Прызнаныя аўтарытэты ў галіне дзіцячай літаратуры К. І. Чукоўскі, С. Я. Маршак адзначалі, што ўжо з чатырохгадовага ўзросту можна і неабходна знаёміць дзяцей з сур'ёзнымі, «дарослымі» творамі.

Таму натуральна, што ў наступны пласт дзіцячага чытання ўвайшлі творы класічнай літаратуры, якія створаны спецыяльна для дзяцей, ці тыя, што перайшлі з «дарослага» ў разрад «дзіцячага» чытання. Да іх адносяцца творы А. Пушкіна, Л. Талстога, І. Буніна, А. Купрына, А. Чэхава, К. Ушынскага, Я. Коласа, Я. Купалы, А. Блока, А. Фета, Ф. Багушэвіча, Ф. Цютчава, М. Багдановіча, В. Гюго і інш. Вядомы беларускі пісьменнік Я. Колас падкрэсліваў неабходнасць уключэння ў кола дзіцячага чытання твораў пісьменнікаў-класікаў. Ён адзначаў, што пры кожным новым прачытванні гэтыя творы адкрываюць чытачам «усё новыя думкі, настроі, пачуцці, ідэі... І трэба як найраней прышчапляць дзецям любасць да гэтых пісьменнікаў. А гэтая любасць дасягаецца толькі чытаннем» [2].

У трэцюю частку, якая складае кола дзіцячага чытання, увайшлі тыя творы ўласна дзіцячай літаратуры, якія спецыяльна напісаны для дзяцей пэўнага ўзросту пісьменнікамі К. Чукоўскім, С. Маршаком, А. Барто, Э. Агняцвет, В. Віткам, Д. Хармсам і інш. Сучаснае дзіця немагчыма сабе ўявіць без захапляючых кніг М. Карэма, Д. Бісета, Ф. Грубіна, А. Босева, Нагуці Удзе, Л. Берга, У. Дыснея, Р. Кіплінга, Л. Кэрала, Д. Харыса.

Спіс класічных і сучасных мастацкіх твораў і пісьменніцкіх імёнаў можна пашырыць. Аднак для таго каб адбыўся кантакт паміж маленькім слухачом і кнігай, неабходна, каб дзіця праслухала прапанаваны яму твор і асэнсавала яго.

Спісы твораў дзіцячай літаратуры знаходзяцца ў праграме выхавання і развіцця дзяцей дашкольнікаў, па якой працуе дзіцячая дашкольная ўстанова. У некаторых праграмах матэрыял размеркаваны па кварталах навучальнага года з улікам выхаваўча-адукацыйнай работы, якая праводзіцца на кожным узроставым этапе.

Неабходна адзначыць, што ў праграмы немагчыма ўключыць усе лепшыя творы з «залатога» фонду дзіцячай літаратуры. Выхавальнік можа самастойна ўключаць у кола дзіцячага чытання тыя мастацкія творы, якія, на яго погляд, найбольш падыходзяць да ўспрымання іх дзецьмі пэўнай узроставай групы. Усе тыя творы, якія педагог лічыць мэтазгоднымі для выкарыстання, павінны арыентавацца на развіццё інтэлекту дзіцяці, фарміраванне эстэтычных і этычных адносін да літаратурнага мастацтва і выхоўваць у дашкольнікаў такія агульначалавечыя каштоўнасці, як ісціна, дабро і прыгажосць.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Запорожец А. В.* Психология восприятия ребенком-дошкольником литературного произведения // Избр. психол. тр.: В 2 т. М., 1986. Т. 1. С. 72—73.
2. *Колас Я.* Збор твораў: У 14 т. Мн., 1976. Т. 12. С. 494.

*SUMMARY*

*This article demonstrates the role of the fiction litterature in the development of children's speech. The circle of children's reading is shown, the peculiarities of adoption of the books for children by children themselves are analysed.*

*УДК 37.035.6:78*

***Е. О. Брель, Г. В. Шостак***

# ПРИОБЩЕНИЕ ПОДРОСТКОВ К НАЦИОНАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЕ СРЕДСТВАМИ СОВРЕМЕННОГО МАССОВОГО МУЗЫКАЛЬНОГО ИСКУССТВА

В современных условиях благодаря развитию музыкальной индустрии ориентации подростков в области музыки формируются главным образом под воздействием средств массовой коммуникации и общения со сверстниками. Это часто приводит к потреблению музыкальных образцов сомнительного эстетического качества, рассчитанных на невзыскательный вкус. В силу легкости восприятия такие разновидности современной музыки, как эстрадная песня, «диско», рэп, рейв, брит-поп и другие сугубо развлекательные направления, выполняющие не столько эстетическую, сколько коммуникативную и фоновую функции, пользуются в подростковой среде широкой популярностью. В то же время классическая, народная и современная академическая музыка, а также образцы джаза и рок-музыки, несущие определенную смысловую нагрузку, остаются за пределами внимания подростков. Важно отметить, что школьники в большинстве отдают предпочтение образцам зарубежной и российской поп-музыки.